*Інфармацыя Аналітыка Публіцыстыка*

***№3 красавік 2011***

# ПРЭЗУМПЦЫЯ

***Гарадзенскі праваабарончы інфармацыйна-аналітычны бюлетэнь***

**у нумары:**

**Праўда за кратамі ст. 2**



**у нумары:**

**Вызваліць усіх. ст. 3-4**



**у нумары:**

**Хроніка ст. 5**



## Гарадзенцы Алесь Кіркевіч і Андрэй Пачобут за кратамі





***Суд Кастрычніцкага раёна г. Мінска, прызнаў гарадзенца Алеся Кіркевіча вінаватым ва ўдзеле ў масавых беспарадках 19-га снежня 2010-га году ў Мінску, і пакараў яго пазбаўленнем волі на 4 гады.***

***Намесьніка старшыні незарэгістраванай арганізацыі "Малады фронт" Алеся Кіркевіча асудзілі паводле ч.2 арт.293 Крымінальнага кодэксу — актыўны ўдзел у масавых беспарадках.***

***Гарадзенскі журналіст і актывіст Андрэй Пачобут па-ранешаму знаходзіцца пад вартай. Яму было адмоўлена ў замене меры стрымання.Ніякіх следчых дзеянняў у дачыненні да Андрэя Пачобута пакуль не праводзіцца.***

***Паводле першага пункту арт. 386 КК, журналісту пагражае пакаранне ў выглядзе штрафу або пазбаўлення волі тэрмінам да двух гадоў.***

# Праўда за кратамі



Халодная вільгаць шэрага муру, трывожныя позіркі сукамернікаў і абразы носьбітаў закону і правапарадку...Жорсткая рэальнасць, якая ўжо настолькі фундаментальна увайшла ў жыцце, што стала падавацца, у цэлым, заканамернай.

Месяц у засценках гарадзенскай вязьніцы № 1, на працягу якога ажыццяўляецца нахабны гвалт над сумленнем, натуральным правам.

Вядома, праўду не схаваеш за кратамі, але, аказваецца, вельмі легка абмежаваць яе распаўсюджванне шляхам знішчэння носьбіта, зрабіўшы яе уласнай існасцю непачутага прарока.

Андрэй Пачобут - юрыст, журналіст, спецыяльны карэспандэнт газэты "Выборчай".Пасля падзеяў 19 снежня ен ужо прайшоў праз пeратрусы, канфіскацыю маемасці, адміністрацыйныя суткі арышту на Акрэсціна.

Але і гэтай чаргі падзеяў сталася мала, каб зрабіць яго, уцэлым, бяспечным у дачыненні да падрыву "стабільнасці" у нашым грамадстве.

6 красавіка Пачобут быў арыштаваны і змешчаны ў турму па факту ўзбуджэння на яго адразу 2 крымінальных справаў:

-артыкул 367, частка першая Крымінальнага Кодэксу РБ:"Нагавор на прэзідэнта РБ".

Пакаранне прадугледжвае штраф,выхаваўчую працу на працягу 2 гадоў, абмежаванне свабоды на 4 гады, або яе пазбаўленне тэрмінам на 4 гады;

-артыкул 368, частка першая Крымінальнага Кодэксу РБ:"Абраза прэзідэнта РБ".

Пакаранне прадугледжвае штраф, выхаваўчую працу да 2 гадоў, арышт тэрмінам да 6 месяцаў, абмежаванне свабоды да 2 гадоў, пазбаўленне волі да 2 гадоў.

Крымінальныя справы ўзбуджаны паводле публікацый Пачобута ў газэце "Выборчая", на сайце "Беларускі партызан" і на ўласнай старонцы ў Live Journal.

Заходжу ў архіў вышэй названых інтэрнэт-выданняў, бяру ў поле зроку тэксты Пачобута, прабягаю па іх вачыма...

Я бачу свае ўласныя меркаванні і меркаванні, паводле падліку незалежных назіральнікаў, як мінімум шасцідзесяці адсоткаў насельніцтва Беларусі. АЛЕ! Мала хто з нас мае такі ўплыў на грамадства, як Анджэй Пачобут.

Прачытаўшы артыкулы Пачобута, мне хочацца гучна заявіць пракуратуры : " Я падзяляю меркаванні Пачобута і падпісваюсь пад яго словамі!".

***Дамініка Калоша***

# Што думаюць гродзенцы пра суд над Алесем Кіркевічам



***Крымінальны працэс у сталіцы па справе аб так званых масавых беспарадках у Мінску 19 снежня, дзе фігуруе ў якасці абвінавачанага і гродзенец Алесь Кіркевіч, адзін з лідараў "Маладога фронту", у горадзе над Нёманам не заўважаны шырокай грамадскасцю. Нямала, аднак, і тых, хто неабыякавы да лёсу маладога хлопца з актыўнай пазіцыяй. Так, колішні выкладчык Кіркевіча Алесь Госьцеў выступіў на судзе ў якасці сведкі і выразна даў станоўчую характарыстыку свайму былому вучню. Выказваюцца на конт палітычнага працэсу і іншыя гродзенцы.***

**Ніна Гургенаўна, цёшча Алеся Кіркевіча:**

"Я была ў Мінску ў сама першы дзень разгляду справы. Адразу адмоўна ўразіла сама арганізацыя судовага працэсу, у залі вельмі кепска чуваць тых, хто прамаўляе. Суддзя адводзіць усе вострыя пытанні адвакатаў, аргументы якіх ушчэнт разбіваюць абвінавачванні. А ўвогуле, канешне, вельмі хвалюемся за лёс Алеся, бо ў такой сітуацыі нельга спадзявацца, што разгляд справы скончыцца справядліва".

**Анжэла, грамадская актывістка:**

"Я некалькі разоў бачыла Кіркевіча на вулічных грамадскіх акцыях. Адчуваецца, што гэта чалавек з моцнымі перакананнямі. Перакананa, што гэты перaслед не зменіць ягоныя погляды".

**Віктар Сазонаў, грамадскі праваабаронца:**

" Не мог зразумець ад пачатку, і не магу зразумець зараз, за што судзяць гэтага шчырага, набожнага, законапаслухмянага актывіста. Бо яго папярэдняя дзейнасць як актыўнага грамадзяніна, які змагаецца за паляпшэнне сітуацыі ў краіне, не выходзіла за межы дазволенага нашым заканадаўствам. Таму у гэтым працэсе трэба шукаць зусім іншы падтэкст. На маю думку гэтая справа цалкам палітызаваная".

# Валянцін Стэфановіч : «Улада мае годнае выйсце - вызваліць усіх»

***Валянцін Стэфановіч - не толькі «змагар» за правы чалавека, але і высакакласны юрыст. З праваабарончай арганізацыяй «Вясна-96» (цяпер «Вясна») пачаў супрацоўнічаць яшчэ студэнтам, а ў 1998 годзе перайшоў туды на сталую працу. Прапануем увазе чытачоў яго інтэрв'ю карэспандэнта Аляксандра Тамковіча.***

Пачну з таго, што я зараз шкадую, што не зрабіў гэта інтэрв'ю раней. І зусім не таму, што нічога не чуў аб адным з самых прыкметных праваабаронцаў сучаснай Беларусі. Проста да гэтага часу не прадастаўлялася магчымасці запісаць нашу гутарку на дыктафон. А пашкадаваў таму, што Валянцін Стэфановіч апынуўся не толькі традыцыйным «змагаром» за правы чалавека, колькасць якіх расце ў зваротнай прапарцыянальнасці да колькасці гэтых самых правоў (чым менш іх становіцца, тым больш жадаючых нас абараняць), але і высакакласным юрыстам. А яшчэ - разумным чалавекам.



Нарадзіўся ён у Менску, скончыў юрыдычны факультэт з чырвоным дыпломам. Прычым зрабіў гэта пасля службы ў войску, так як, скончыўшы школу, адразу нікуды не паступіў. Дарэчы, прызываўся В. Стэфановіч на вайсковую службу яшчэ ў часы СССР, а звальняўся ў запас зусім у іншай дзяржаве, бо служыць яму давялося з 1990 па 1992 гады.

Перыяд свабоды тых гадоў, як вядома, доўжыўся нядоўга. З праваабарончай арганізацыяй «Вясна-96» (цяпер «Вясна») ён пачаў супрацоўнічаць яшчэ студэнтам, а ў 1998 годзе перайшоў сюды на сталую працу. За гэта час паспеў паўдзельнічаць у стварэнні «Маладога Фронту» і нават быў адным з намеснікаў яго сустаршыні, а таксама папрацаваць юрысконсультам на Мінскім падшыпнікавым заводзе.

**- Якая сітуацыя, на ваш «праваабарончы» погляд, сёння склалася ў Беларусі?**

- Пасля 19 снежня яна вельмі моцна змянілася. У параўнанні з тым, што мы назіралі два папярэдніх гады, адбыўся вельмі моцны адкат назад. Канец 2008 года, увесь 2009-ы і перыяд да 19 снежня 2010 года - гэта час, калі ўлады праводзілі палітыку лібералізацыі.

Калі глядзець у мінулае з пазіцый сённяшняга дня, становіцца абсалютна зразумелым, што ўся яна зводзілася толькі да зніжэння ўзроўню рэпрэсій. Ніякіх сістэмных зменаў мы, на жаль, не ўбачылі, хаця менавіта яны маглі сведчыць аб тым, што Беларусь сапраўды імкнецца да прадэкларыраванай мэты. І што працэс гэты становіцца незваротным. Сітуацыя змянілася да горшага.

Ўлады вярнуліся да найбольш жорсткай, рэпрэсіўнай формы сваіх паводзінаў у кіраванні краінай. Такой колькасці палітвязняў за усе 13 гадоў маёй праваабарончай дзейнасці яшчэ не было! Пасля 19 снежня 2010 года ўпершыню ў гісторыі Беларусі былі ўзбуджаныя крымінальныя справы па артыкуле 293 КК РБ. Раней падобнай практыкі не існавала.

Дарэчы, адкат у мінулае назіраецца не толькі ў палітычнай сферы. Можна ўзгадаць (нягледзячы на афіцыйнае адмежаванне) і «чорныя спісы» музыкаў, іншых непажаданых ўладзе дзеячаў культуры, і незаконнае звальненне з працы за іншадумства, і выключэнні з ВНУ. Усё гэта сведчыць аб тым, што адкат вельмі сур'ёзны, ён закрануў усе сферы нашага жыцця.

**- Пасля 19 снежня некалькі тыдняў запар адбываліся арышты іператрусы. Цяпер пачаліся судовыя працэсы, і ўжо прагучалі першыя прысуды. Якое пра іх ўражанне ў юрыста і праваабаронцы?**

- На многіх з іх я быў асабіста. Мы адсочваем іх уважліва. Першая выснова (пра што неаднаразова заяўлялася) - мая нязгода з тым, што гэтыя падзеі класіфікуюцца як масавыя беспарадкі. Зыходзячы з артыкула 293 КК, пад такімі маецца на ўвазе сукупнасць дзеянняў - «падпалы, пагромы, супраціў супрацоўнікам міліцыі пры знішчэнні маёмасці і гвалце над асобай». Падкрэсліваю, менавіта сукупнасць гэтых дзеянняў, таму што Крымінальны кодэкс у дадзеным выпадку не кажа пра тое, што магчыма нешта адно. У артыкуле няма слоў «альбо», «ці», гэта значыць пералік ідзе праз коску.

Другое. Маштабнасць. Калі браць тыя ж пагромы, то тут маюцца на ўвазе дзеянні агалцелага шматлікага натоўпу, якія носяць характар гвалту над асобай, значнае прынясенне шкоды якой-небудзь маёмасці, працяглясць па часе і г.д. Усяго гэтага, на наш погляд, няма.

Так, па відэа- і іншых матэрыялах следства відаць, як нейкая нязначная частка грамадзян (дэманстрантаў ці не) здзяйсняе актыўныя дзеянні, якія можна расцэньваць як парушэнне правапарадку, але ў любым выпадку гэта не ёсць "масавыя беспарадкі». На праведзеных ўжо судах тыя ж супрацоўнікі міліцыі паказалі, што на ганку Дома ўраду было ад 30 да 40 чалавек. Гэта з улікам журналістаў, што там знаходзіліся. Гэта значыць сапраўдная колькасць «паг-

ромшчыкаў» у рэальнасці каля 20. У параўнанні з дзесяткамі тысяч дэманстрантаў, якія стаялі на плошчы, гэта вельмі нязначная колькасць.

Гэта наводзіць на пэўныя разважанні. Перш за ўсё, на пытанне аб тым, чаму органы правапарадку не спынілі беспарадкі адразу? Для той канцэнтрацыі міліцыянтаў, якая тады была на плошчы Незалежнасці, справіцца з задачай было лягчэй, чым чыхнуць.

Але ж артыкул да «пагромшчыкам» ужываецца вельмі цяжкі, з сур'ёзнымі санкцыямі. Яе першая частка прадугледжвае пакаранне ад 5 да 15 гадоў пазбаўлення волі, другая – ад 3 да 8 гадоў. Такім чынам, адказнасць не абы-якая. Працэсы ж праходзяць, мякка кажучы, у хуткім тэмпе. Справу першага абвінавачанага Парфенкова суд разглядаў ўсяго адзін дзень. Так павінна быць толькі з нейкімі адміністрацыйнымі правапарушэннямі. І тое нязначнымі. Тут жа гаворка ідзе аб немалых тэрмінах пазбаўлення волі.

Доказаў, на мой погляд, у судзе важкіх не было. Сведак (супрацоўнікаў міліцыі), як і пацярпелых, таксама. Адзінае, што зафіксавала відэаздымка: Парфянкоў штурхаў і наносіў ўдары па нейкім драўляным канструкцыям, якімі былі перагароджаны пабітыя ўжо вокны і дзверы Дома ўрада. Пры гэтым у грамадзянскім пазове ў пераліку сапсаванай маёмасці ніякіх драўляных канструкцый няма. Там ёсць шкло, шклопакеты, восем метраў вадасцёкавай трубы і пяць кустоў ядлоўца. Пераканаўчых доказаў таго, што Парфянкоў непасрэдна здзяйсняў нейкія «масавыя беспарадкі», суду ніхто не прадставіў.

Што, зрэшты, не перашкодзіла даць яму чатыры гады. Атрымліваецца, што чалавека пакаралі толькі за тое, што ён быў раней судзімы. Менавіта гэта прагучала ў каментарах на судзе.

На мой погляд, па шэрагу спраў чыя-небудзь віна ў здзяйсненні злачынства, прадугледжанага часткай другой артыкула 293 КК, адсутнічае, таму што адсутнічае факт самога злачынства. Ніякіх доказаў "масавых беспарадкаў", паўтаруся, у судах прадстаўлена не было, бо іх не было на самой справе. Тое ж самае і з нагоды ўдзелу падсудных у нейкіх супрацьпраўных дзеяннях.

«Белыя ніткі» выглядалі так відавочна і тапорна, што неўзабаве ў судах пачалі з'яўляцца «пацярпелыя». Упершыню ў справе Гапонова-Брэуса, пазней у справе Мядзведзя і Ліхавіда. Усе без выключэння пацярпелыя – супрацоўнікі міліцыі. Спачатку іх было 15 чалавек, потым стала 29.

Дарэчы, з 29 пацярпелых па справе 20-гадовага Ліхавіда 22 належным чынам не зафіксавалі нанесеныя ім цялесныя пашкоджанні. Іншымі словамі, экспертыза не змагла ўстанавіць тое, што



такавыя мелі месца ... Як і вызначыць іх цяжар, спосабы нанясення і г.д., таму што гэтыя асобы не з'явіліся на адпаведны агляд судова-медыцынскай экспертызы. Шпіталь, у які яны звярнуліся ў ноч на 20 снежня 2010 года і наступныя суткі, не прадаставіў на гэты конт ніякіх медыцынскіх дакументаў. Усе сцвярджэнні аб пашкоджаннях грунтуюцца толькі на запісах у журнале шпіталя. І ўсё.

Мусіць, камусьці вельмі хацелася даказаць, што меў месца нейкі гвалт. І такім чынам апраўдаць ўласныя дзеянні ...

Яшчэ адзін нюанс. Ўсе пацярпелыя з'явіліся ўжо пасля таго, як была скончана вытворчасць па справе. Раней яны там не фігуравалі.

Мы прынцыпова не згодныя з вылучэннем крымінальных спраў у асобную вытворчасць. Расследаванне па ім яшчэ не скончана, фактаў масавых беспарадкаў як такавых яшчэ не ўстаноўлена. Следства пакуль толькі вядзецца, а людзей ужо судзяць ...

Такое ўражанне, што ствараецца база, якая пазней дазволіць спасылацца на факты, устаноўленыя ў папярэдніх працэсах. Думаю, сэнс дзеяньняў уладаў менавіта ў гэтым і складаецца.

**- А чаму некаторым з фігурантаў змякчылі абвінавачванні?**

- У апошні час гэты пытанне мне задаюць часцей за ўсё.

У прынцыпе, крымінальнаму заканадаўству гэта не супярэчыць. Калі адсутнічаюць прыкметы масавых беспарадкаў, то абвінавачванні могуць быць перакваліфікаваныя ў хуліганства ці групавыя дзеянні, якія груба парушаюць грамадскі парадак. У гэтай частцы ніякіх прэтэнзій няма, але ўзнікаюць пытанні адносна раней вынесеных прысудаў. Напрыклад, відэаздымка не зафіксавала якіх-небудзь дзеянняў з боку Аляксандра Атрошчанкава, які атрымаў чатыры гады калоніі ўзмоцненага рэжыму. Як і ў Бреуса з Гапоновым. Яны знаходзіліся ў натоўпе і былі прызнаныя вінаватымі толькі за гэта ...

Вядома, новыя абвінавачванні, вылучаныя да асобных фігурантам, больш мяккія. Акрамя трох гадоў зняволення пад вартай яны прадугледжваюць іншыя формы пакарання. Напрыклад, штрафы альбо «хімію». З чым канкрэтна звязана гэтая перакваліфікацыя, судзіць не бяруся, але, магчыма, гэта пагрозы з боку Еўрапейскага саюза і ЗША перайсці да больш сур'ёзных санкцыяў у адносінах да беларускіх уладаў. Можа быць, эканамічных.

Аднак перакваліфікацыя толькі «фігавы лісток». Выглядае яна непераканаўча. Па-ранейшаму ёсць тыя, хто абвінавачваюцца ў арганізацыі і ўдзеле ў масавых беспарадках. Гэта Ус, Статкевіч, Саннікаў, Лябедзька і іншыя. Усім ім пагражаюць даволі сур'ёзныя тэрміны.

Нават калі ўсім тым, каму «змякчылі» абвінавачванне, суды вынесуць прысуды, не звязаныя з пазбаўленнем свабоды, па вялікім рахунку, беларускім уладам нічога гэта не дае.

Па маім глыбокім перакананні, у іх ёсць дастойны выхад са склаўшагася становішча: вызваліць усіх. Вельмі хочацца спадзявацца на тое, што ўлады выберуць менавіта яго.

*Аляксандр Тамковіч*

# Хроніка правапарушэнняў

## ((( Гарадзеншчына, красавік )))

**Гарадзенскія журналісты,** сябры Беларускай Асацыяцыі Журналістаў, **30 сакавіка** правялі экстраннае паседжанне, на якім было вырашана падрыхтаваць і накіраваць ліст пратэсту ў Гродзенскую абласную пракуратуру. Незалежныя журналісты абураныя іх пастаяннай дыскрымінацыяй і татальным праследам, а таксама тым фактам, што пракуратура распачала крымінальную справу па артыкуле за абразу прэзідэнта ў дачыненні да Андрэя Пачобута, вядомага публіцыста і блогера, уласнага карэспандэнта "Gazety Wyborczej". **Гарадзенскія журналісты пратэстуюць супраць гвалтоўнага парушэння іх канстытуцыйных правоў і заклікаюць пракуратуру спыніць рэпрэсіі і закрыць крымінальную справу Андрэя Пачобута.**

**6 красавіка**, у Ленінскім судзе горада Гродна ўрэшце завяршыўся разгляд адміністрацыйнай справы Кацярыны Герасімчык, якая была затрыманая міліцыянтамі яшчэ ў лютым па падазрэнні ў нанясенні графіці на пастамент помніка Леніна. На яе быў складзены адпаведны пратакол, а ў студэнцкім інтэрнаце праведзеныператрус. Урэшце суддзя Наталля Козел прызнала моладзевую актывістку вінаватай і пакарала яе штрафам у памеры 15 базавых велічынь паводле артыкулу за дробнае хуліганства.

**21 красавіка** ваўкавыскі грамадска-палітычны актывіст Віталь Гуляк быў затрыманы міліцыяй за расклейку плакатаў з партрэтамі палітычных рэпрэсаваных. Пасля таго, як былі ўзятыя тлумачэнні, яго адпусцілі.

**21 красавіка** гарадзенца Паўла Станеўскага, якога затрымалі ў Менску разам з Паўлам Левінавым, Вольгай Карач і Алегам Баршчэўскім, засудзілі да 8 сутак арышту ў судзе Фрунзенскага раёна Менску.

**22 красавіка** старшыня гарадской арганізацыі Партыі БНФ Вадзім Саранчукоў наведаў Гарадзенскі гарвыканкам з мэтай даведацца, чаму не даюць адказ на заяўку партыі на правядзення пікету, прымеркаванага да угодкаў чарнобыльскай трагедыі. Высветлілася, што ў правядзенні пікету партыі адмоўлена. Са зместу адмовы вынікае, што нібыта заяўнік парушыў артыкулы 4 і 5 Закону "Аб масавых мерапрыемствах Рэспублікі Беларусь". Па-сутнасці атрымліваецца, што грамадзянаў абмяжоўваюць у канстытуцыйных правах. Адмоўлена ў правядзенні пікету было і грамадска-палітычнаму актывісту



з Варнянаў Мікалаю Уласевічу. Заяўка на акцыю падавалася пад дэвізам "Чарнобыль-Фукусіма-Астравец: ці нам гэта трэба?"

**26 красавіка** ў Ваўкавыску нарадам міліцыі зноў быў затрыманы грамадскі актывіст Віталь Гуляк. Гэта адбылося, калі ён расклейваў на рэкламных месцах гораду партрэты палітычных зняволеных. Віталя Гуляка адвезлі ў мясцовы РАУС, дзе ён быў дапытаны начальнікам гарадской міліцыі. Праз некаторы час на прафілактычную гутарку з актывістам з'явіўся прадстаўнік мясцовага КДБ, які палохаў Гуляка крымінальнай адказнасцю за "удзел у масавых несанкцыянаваных акцыях". Прадстаўніца, аднак, прадстаўнік спецслужбаў катэгарычна адмовіўся.

У Гародні працягваецца ціск на праваабаронцу з БХК Святлану Рудкоўскую, якая актыўна працавала ў назіранні на апошніх выбарчых кампаніях. Нагадаем, што ў лютым бягучага году АБЭЗ Ленінскага РАУС г. Гродна двойчы правяраў фінансава-гаспадарчую дзейнасць Святланы Рудкоўскай як старшыні жыллёва-будаўнічага кааператыва. Пры тым аніякіх парушэнняў выяўлена не было. Але далей зачэпкі да праваабаронцы не скончыліся. У сярэдзіне красавіка яе выклікаў участковы міліцыянер Ленінскага РАУС Андрэй Шэлег. Падставай паслужыла заява ў міліцыю ад 11 красавіка, якую напісала сям'я супрацоўнікаў спецслужбаў Каяновіч, якая пражывае ў доме ЖБК №8. Паводле заявы, Рудкоўская нібыта не выдавала кнігу скаргаў і прапановаў. Рудкоўская дала ўчастковаму свае тлумачэнні, пасля чаго міліцыянер сказаў, што не бачыць падставы для складання пратаколу пра адміністрацыйнае правапарушэнне, і на гэтым справа вычарпана. Аднак, на наступны дзень той сама ўчастковы Шэлег патэлефанаваў і паведаміў, што пратакол па патрабаванні начальства ўсё ж будзе складзены – паводле артыкулу 9.24 Кодэксу аб адміністрацыйных правапарушэннях. Па гэтым артыкуле Рудкоўскай пагражае штраф ад 4 да 10 базавых велічынь. Праваабаронца з такім станам рэчаў катэгарычна нязгодная, лічыць такі падыход правакацыяй.

Кацярыне Герасімчык праз два месяцы аддалі забраныя пад час ператрусу рэчы, у тым ліку ноўт-бук. Нагадаем, што **12 лютага** моладзевая актывістка была затрыманыя супрацоўнікамі міліцыі непадалёк помніка Леніна па падазрэнні ў нанясенні на пастамент графіці. З раніцы ў яе інтэрнацкім пакоі быў праведзены вышук, пад час якога і быў забраны кампутар. 6 красавіка Герасімчык Ленінскім раённым судом Гродна была засуджаная да штрафу у памеры 525 тысяч рублёў. Кацярына Герасімчык падавала некалькі скаргаў на дзеянні супрацоўнікаў міліцыі і патрабавала вярнуць забраныя рэчы. У адзін з дзён Кацярыне патэлефанаваў участковы міліцыянт і сказаў, што рэчы будзе магчыма вярнуць пасля суда. Пасля вынясення прысуду Герасімчык зноў стала патрабаваць свой ноўт-бук, які ўрэшце быў вернуты.

# Электрычнае крэсла



***Японія не Савецкі Саюз, у якім атамная станцыя абавязкова мусіла некалі ўзарвацца з-за недасканалых тэхналогій і сацыялістычнай нядбайнасці. І не Расійская Федэрацыя, дзе перыядычна і пастаянна здараюцца аварыі на электроўнях усіх відаў і выглядаў, паступова падбіраючыся і да ядзерных. І ўсе гэтыя трагедыі ў Расіі здараюцца па ўсё тых жа запазычаных з СССР прычынах, якія Расія атрымала ў спадчыну разам з імперскім мышленнем і татальным кантролем КГБ за ўсімі працэсамі ў грамадстве і эканоміцы. Ну і канешне Японія не сённяшняя Беларусь, дзе небяспечны аб'ект можа выбухнуць яшчэ да пачатку сваёй працы, бо яго абавязкова хтосьці хоча паставіць акурат на адзіным вялікім сейсмічным разломе, які ёсць на яе тэрыторыі.***

Тыя, хто настойвае на пабудове атамнай станцыі менавіта на Астравеччыне, у сваёй прапагандзе якраз і спасылаюцца на досвед Японіі. Кажуць, што там уся тэрыторыя сейсмічнаактыўная. І што з таго? Атамныя электроўні, маўляў, там паставілі, і нічога з імі не робіцца.

Але зрабілася. Трагедыя навалілася па даўно заўважанаму назіральнымі людзьмі закону тэатра – калі ў першым акце на сцяне вісіць стрэльба, то як мінімум у трэцім яна павінна пальнуць. Электроўня, пастаўленая на сейсмічнанебяспечнай тэрыторыі не вытрымала землятрусу. Дысцыплінаваныя японцы, узброіўшыся сваім багатым досведам змагання з радыяцыяй, навейшымі здабыткамі японскай і сусветнай медыцыны, найноўшымі і надзвычай дасканалымі тэхнічнымі вынаходніцтвамі, змагаюцца за мінімілізацыю наступстваў трагедыі. Але, хоць японскія праектыроўшчыкі атамных электроўняў зрабілі усё мажлівае на выпадак аварыі, ахвяраў, ад праблем непасрэдна на электроўні, пазбегнуць не ўдалося. Тым хто загінуў, ужо не патрэбны ні танная электрычнасць, ні перспектывы развіцця мірнага атама.

АЭС "Фукусіма-1" не змагла вытрымаць вялікага прыроднага катаклізму. А ў Беларусі, менавіта на Астравеччыне зафіксаваны прэцэдэнт самага моцнага беларускага землятрусу.

У 1909 годзе, у выніку падземных штуршкоў, там з'явіўся глыбокі роў з вярсту. Пазней, беларускія навукоўцы ацанілі той землятрус у сем балаў паводле шкалы Рыхтара. Гэтага дастаткова, каб знішчыць нават надзвычай моцны аб'ект. А каб разбурыць расійскую пабудову




(фінансаваць працу будзе Расія), сямі балаў непатрэбна. Небяспечныя праблемы для аб'екта, які зробіць краіна з спадчынай Савецкага Саюза, з састарэлымі тэхналогіямі, з неякаснымі матэрыяламі і з татальнай эканоміяй на бяспецы, можа нарабіць нават калгасны трактарыст, які рэзнуўшы адзіна якаснага мясцовага прадукту, урэжыцца на вырабе хвалёнага МТЗ у слуп недалёка ад АЭС.

Справа нават не ў тым, што ад планаванай Астравецкай АЭС усяго шэсцьдзесят кіламетраў да Вільні. А да Астраўца, Смаргоняў, Ашмянаў – рукой падаць. І не ў тым, што ў нашых пацярпелых не будзе японскіх тэхналогій ліквідацыі наступстваў. Не будзе і адпаведных сучасных медыкаментаў. Трагедыя ўжо існуе ў тым, што ў нацыянальных навуковых свяцілаў, што настойваюць на астравецкай пляцоўцы, няма мінімальнай павагі да ідывідуальнага чалавечага жыцця і здароўя, якое можа быць падвергнутае небяспецы. Адсутнічае ў іх душах не толькі боль, але нават дробнае перажыванне за здароўе і будучыню нацыі, якая і так узяла на свой генафонд завялікі ўдар пасля Чарнобыльскай трагедыі. Пра ўладу тут няма і гаворкі. Ва ўмовах унутранай духоўнай і ідэалагічнай акупацыі спадзявацца на яе – справа марная.

Беларуская народная мудрасць сцвярджае, што раз на год, нават палка страляе. А хто ведае, колькі ён цягнецца, той атамны год? І калі тая палка стрэльне? Свет ужо пабачыў малыя і вялікія трагедыі, звязаныя з мірным атамам. А беларусы пазналі на сабе сама вялікую ядзерную катастрофу. Можа больш разумным было б хоць нам, сродкі плануемыя на пабудову Астравецкай АЭС, выкарыстаць на пошук новых, бяспечных крыніц энергіі. А не пераўтвараць нашу краіну у суцэльнае электрычнае крэсла, на якое прымусова пасаджаны ўвесь народ, і якое невядома калі можа ўключыцца.

***Віктар Сазонаў***

# Духоўны лейкоз

***Ужо чвэрць стагоддзя пражылі беларусы пасля страшнай катастрофы на чарнобыльскай атамнай станцыі. Папярэднюю такую трагедыю зазналі японцы пад час другой сусветнай вайны. Але там радыяцыя прыйшла ў выніку скідвання на Хірасіму і Нагасакі ядзерных бомбаў. У Беларусь гора прынёс “мірны атам”. Значная частка тэрыторыі нашай краіны, асабліва Палессе, аказалася забруджанай і непрыдатнай для жыцця, дзесяткі тысяч людзей атрымалі апраменьванне рознай ступені, тысячы дзяцей нарадзілася з рознай цяжкасці і характару паталогіяй. Тады яшчэ савецкая дзяржава кінула людзей у бядзе. Многія ратаваліся самы. Прыкладам, бацькі знакамітай тэнісісткі Марыі Шарапавай экстранна выехалі з Гомельшчыны. Будучая маці была тады цяжарная, а Марыя нарадзілася ўжо на расійскіх прасторах. Шарапава не забываецца сваіх каранёў і час ад часу праводзіць розныя дабрачынныя мерапрыемствы, дапамагае хворым чарнобыльскім дзецям. Але такіх як Шарапава няшмат. Бальшыні заможных людзей пляваць на людское гора і хваробы. А грамадскія дабрачынныя фонды, створаныя на золку суверэнітэту, даўно знішчаныя дзяржаўнай палітыкай. Цынізму гэтай палітыкі няма мяжы. Гэта яе праваднікі выганялі людзей на першамайскую дэманстрацыю пад радыяцыйны попел у 1986-ым, гэта яны садзілі радыяктыўныя воблакі з дапамогай авіяцыі на беларускія палеткі і паселішчы. Гэта яны хавалі і хаваюць дагэтуль праўду пра страшныя наступствы таго выбуху. Гэта яны пазбавілі магчымасці працаваць на радзіме і засадзілі ў турму такіх людзей як прафесар Юрый Бандажэўскі – менавіта за тое, што ён адкрыта гаварыў пра сапраўдную небяспеку.***



Толькі дзяржава мае права дапамагаць пацярпелым ад чарнобыльскага выбуху. А дзяржава вуснамі сваіх кіраўнікоў заяўляе, што многія пацярпелыя раёны ўжо бяспечныя для жыцця. Ды днямі прафесар Аляксей Акіянаў з Міжнароднага ўніверсітэту імя Сахарава на буйнай навуковай канферэнцыі ў Мінску заявіў, што спатрэбіцца яшчэ прынамсі 300 гадоў, каб на забруджанай тэрыторыі не засталося цэзію. А ёсць жа яшчэ і іншыя радыяактыўныя элементы. На прыкладзе Хірасімы і Нагасакі дакладна ведама, што адны страшныя хваробы, такія як лейкемія, развіваюцца адразу пасля выбуху, іншыя ж анкалагічныя захворванні з’яўляюцца толькі пасля сарака гадоў. А гэта азначае, што наперадзе непазбежна новыя беды і трагедыі. Ужо аднаго чарнобыльскага выбуху хопіць на тысячу гадоў. Дык не, паводле нейкага сатанінскага праекту (і гэта на фоне японскай катастрофы ў выніку землятрусу!) плануецца пабудова новай атамнай станцыі на шматпакутнай беларускай зямлі. Гіганцкі праект чужой дзяржавы, якая хоча пераўтварыць Беларусь у залежную калонію. Насельнікі ж Беларусі не задумваюцца над сама галоўным у іх жыцці, не задумваюцца пра лёс сваіх дзяцей і ўнукаў.

Не перастаю захапляцца людзьмі, якія ледзь не ў адзіночку змагаюцца супраць пабудовы новай атамнай станцыі ў Беларусі. Грамадска-палітычны актывіст з мястэчка Варняны Мікалай Уласевіч да трагічнай гадавіны Чарнобылю падаў заяўку на інфармацыйны пікет пад назвай “Чарнобыль-Фукусіма-Астравец: нам гэта трэба?”. Чаму яго так слаба падтрымліваюць іншыя насельнікі Астравеччыны. Адказ просты – многія баяцца, іншыя наіўна спадзяюцца, што з пабудовай АЭС узнікнуць новыя працоўныя месцы. Не іначай як віламі радыянукліды адкідаваць збіраюцца!

Грамадскі дзеяч з Гомеля Юрый Варонежцаў, чалавек рэдкай прынцыповасці, нягледзячы на цяжкі для сябе час і пераслед з боку ўладаў, аддае ўсе сілы, каб супрацьстаяць гэтаму страшнаму праекту. Такія людзі складаюць гонар нашай нацыі, але сёння яны “лішнія”, незапатрабаваныя і канешне не ацэненыя грамадствам. Большасць у грамадстве – гэта пасіўная, часам агрэсіўная маса, якая жыве сённяшнім днём і матэрыяльнымі каштоўнасцямі. Колькасць без ліку ахвяр, паўшых у бai за даляр. У адным мястэчку Гарадзеншчыны на днях нават пабіліся ля абменнага пункту з-за пакупкі валюты. Чым людзі жывуць? Няўжо не задумваюцца пра сваю місію ў гэтым кароткім жыцці на зямлі? “Духоўны лейкоз” не менш страшны чым радыяцыя, ён распаўзаецца па душах яшчэ хутчэй, ён знішчае годнасць і гонар, ён знішчае веру ў чалавецтва. Такія сумныя нататкі ў сумныя ўгодкі Чарнобыльскай трагедыі.

*Уладзімір Хільмановіч*

## *Каляндар памятных і круглых датаў Гарадзеншчыны на травень 2011 году*

**1 траўня**

435 гадоў таму (1576) – Стэфан Баторы стаў каралём Рэчы Паспалітай.

105 гадоў таму (1906) – У Гародні нарадзілася Аляксандра Бергман (дзявочае Кучкоўская), беларуская дзяячка КПЗБ, даследніца гісторыі, вязьня савецкіх канцлягераў.

80 гадоў таму (1931) – У Слоніме нарадзіўся Алег Лойка, беларускі пісьменьнік, літаратуразнавец, перакладнік, педагог.

**5 траўня**

180 гадоў таму (1831) – У маёнтку Рутка (Наваградзкі пав.) нарадзіўся Уладыслаў Борзабагаты, адзін з кіраўнікоў паўстаньня 1863-64, лекар, мемуарыст.

**6 траўня**

250 гадоў таму (1761) – У в. Ясенцы (Вараноўскі р-н) нарадзіўся Станіслаў Юндзіл, прыродазнавец, даследнік расьліннага і жывёльнага сьвету Беларусі.

**8 траўня**

460 гадоў таму (1551) – Памерла Барбара Радзівіл, вялікая княгіня літоўская, каралева польская. Жыла ў Геранёнах з 1538 па 1542.

115 гадоў таму (1896) – У в. Кавалішкі (Браслаўскі р-н) нарадзіўся Антон Дамброўскі, беларускі грэцка-каталіцкі дзеяч, філёзаф, тэоляг. З 1925 працаваў у Альбэртыне і Сынковічах.

**9 траўня**

145 гадоў таму (1866) – У Гародні нарадзіўся Леў Бакст (сапр. Розэнберг), парыжскі жывапісец і графік, тэатральны мастак, заканадаўца моды.

**10 траўня**

45 гадоў таму (1966) – У Лёндане (Вялікабрытанія) памёр Аркадзь Варава (нар. у 1918 у в. Вялікія Жухавічы, Карэліцкі р-н), удзельнік БКА, дзеяч эміграцыі (Вялікабрытанія), выдавец.

25 гадоў таму (1986) – Памёр Аляксандар Карповіч, беларускі выдавец, актывіст КПЗБ. Нараджэнец в. Трашчычы (Карэліцкі р-н).

**13 траўня**

80 гадоў таму (1931) – У в. Казулішкі (Шчучынскі р-н) нарадзіўся Вацлаў Дзежыц, беларускі краязнавец.

**15 траўня**

95 гадоў таму (1916) – У в. Запольле (Наваградзкі р-н) нарадзілася Ніна Тарас, беларуская паэтка.

**16 траўня**

325 гадоў таму (1686) – Паміж Рэччу Паспалітай і Расеяй заключаны “Вечны мір”.

95 гадоў таму (1916) – Памёр Валер’ян Вільчэўскі, лекар, удзельнік паўстаньня 1863-64 у атрадзе Францішка Юндзіла ў Слонімскім пав. Нараджэнец в. Сянно (Наваградзкі р-н).

25 гадоў таму (1986) – У Гародні адчынены Дом-музей Максіма Багдановіча.

**18 траўня**

Міжнародны дзень музеяў.

**23 траўня**

250 гадоў таму (1761) – Шчучын атрымаў герб.

65 гадоў таму (1946) – У менскай турме НКВД памёр Кастусь Езавітаў, дзеяч беларускага нацыянальна-дзяржаўнага адраджэньня, публіцыст, перакладнік, пэдагог, гісторык. Пэўны час (канец 1918-пач. 1919) дзеіў у Гародні.

**24 траўня**

Дзень славянскай пісьменнасьці.

**27 траўня**

140 гадоў таму (1871) – У Францыі вэрсальцамі расстраляны Канстанцін Далеўскі (нар. у 1837 у фальв. Кункулка, Лідзкі пав.), удзельнік паўстаньня 1863-64.

30 гадоў таму (1981) – Памёр Уладзімір Рубацкі, летувіска-беларускі сьпявак. Нараджэнец Ашмянаў.

**28 траўня**

175 гадоў таму (1836) – У в. Субартоніс (Варэнскі р-н, Летува) нарадзіўся Ян Карловіч, лінгвіст, этнограф, фальклярыст, музыказнавец. Жыў у Вішневе (Смургонскі р-н).

**30 траўня**

35 гадоў таму (1976) – У Кінгстане (Антарыё, Канада) памёр Аляксей Грыцук, дзеяч беларускай эміграцыі (Канада). У 1930-ыя быў на вайсковай службе ў Лідзе.

5 гадоў таму (2006) – У Гародні памёр Алесь Ліпень, беларускі мастак, скульптар.

РАЦЫЯ 98,1 99,2 FM

***Кожны аўторак у эфіры незалежнай радыёстанцыі “Радыё Рацыя” - праграма “Людзьмі звацца!”, якая асвятляе падзеі, датычныя правоў чалавека на Беларусі. Час выхаду ў эфір – 15-05 (паўтор - серада 0:05-1:00 і субота 7:05-8:05). Таксама ў гэты час яе можна слухаць праз інтэрнэт на сайце***

**www.racyja.com**

***Праваабарончую інфармацыю па Беларусі вы можаце атрымаць на сайце***

**www.spring96.org**

Гарадзенскі праваабарончы
інфармацыйна-аналітычны
бюлетэнь «Прэзумпцыя»
выходзіць 1 раз у месяц
наклад 299 асобнікаў
для нутранога карыстаньня

падрыхтаваны да друку:
красавік 2011 г.
e-mail:prezumpcyja@gmail.com
распаўсюджваецца задарма
пры перадруку спасылка
абавязковая

